Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
2020

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;
*А. А. Крыштаносава,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*Т. Ф. Сухоцкая,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*Л. К. Кухто,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*В. М. Сакалова,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (пратакол № 13 ад 26.11.2018);
*С. У. Данскіх,* загадчык кафедры турызму і культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 29.10.2018);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 20.02.2019);
*навукова-метадычным* саветам па культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці (пратакол № 2 ад 09.04.2019)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Фундаментальная культуралогія» накіравана на рашэнне сацыяльна значных задач сучаснага полікультурнага грамадства, мае фундаментальны характар, адрозніваецца міждысцыплінарным падыходам і арыентавана на фарміраванне ў студэнта неабходных кампетэнцый для вырашэння канцэптуальных, даследчых і прыкладных задач у розных сферах жыццядзейнасці.

Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі ажыццяўляецца з улікам тэарэтычных і прыкладных дасягненняў такіх вучэбных дысцыплін дзяржаўнага кампанента, як «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)», «Філасофія». На веды, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальная культуралогія», студэнты абапіраюцца пры вывучэнні такіх вучэбных дысцыплін дзяржаўнага кампанента, як «Тэорыя і гісторыя культуры», «Прыкладная культуралогія», і дысцыплін кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі «Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў», «Сацыялогія культуры» і г. д.

Дадзеная тыпавая вучэбная праграма складзена з улікам змен адукацыйнай парадыгмы і вызначаецца адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі. Праграма адлюстроўвае ўнутраную логіку вывучаемых метадычных праблем, арыентуе будучых спецыялістаў на дзейнасць па авалоданні сучаснымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальная культуралогія» з’яўляецца высвятленне сфарміраванасці ў студэнтаў трывалых навыкаў і ўменняў, якія неабходны для рацыянальнай арганізацыі практычнай дзейнасці, а таксама для паспяховага вырашэння навукова-даследчых задач у сферы культуры.

Важнейшымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– выяўленне ступені авалодання студэнтамі заканамернасцямі функцыянавання культуры;

– вызначэнне ўзроўню асэнсаванасці сутнасці культуры і заканамернасцей яе дынамікі, унікальнага вопыту дыялогу культур, што асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі;

– высвятленне грунтоўнасці ведаў па праблемах марфалогіі, тыпалагізацыі культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выяўленне ступені сфарміраванасці ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, які грунтуецца на авалоданні імі сучаснымі метадалагічнымі падыходамі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальная культуралогія» студэнты павінны *ведаць:*

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– марфалогію культуры;

– сэнс базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– праблемы міжкультурных камунікацый у кантэксце глабалізацыйных працэсаў;

– прыкладныя магчымасці культуралогіі ў сацыякультурнай сферы;

*умець:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– крытычна ўспрымаць сімвалы, плыні, феномены сусветнай і нацыянальнай культуры;

– ацэньваць асаблівасці міжкультурных камунікацый;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць дзейнасць у галіне культуры;

– адаптавацца ва ўмовах мультыкультурнай сітуацыі;

– аналізаваць артэфакты з семіятычнага, аксіялагічнага пунктаў гледжання;

– характарызаваць творы класічнай і масавай культуры;

*валодаць:*

– важнейшымі метадалагічнымі парадыгмамі, прынцыпамі і метадамі культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– методыкай прагназавання, планавання і ажыццяўлення дзейнасці ў галіне культуры.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) студэнт павінен развіць наступныя акадэмічныя кампетэнцыі:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне культуралогіі.

Студэнт таксама павінен развіць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-9. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

Акрамя таго, студэнт павінен набыць наступныя прафесійныя кампетэнцыі:

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

ПК-5. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-7. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне культуралогіі.

ПК-8. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-9. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп'ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Фундаментальная культуралогія» ўсяго прадугледжана 92 гадзіны, з якіх 54 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 30 гадзін, семінары – 24 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| *Тэма 1.* Пралегамены да культуралогіі | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Станаўленне культуралогіі | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 3.* Беларуская айчынная культуралагічная думка | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Культуралогія як навука | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Метады культуралогіі | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 6.* Структура культуралогіі і яе месца ў сістэме навук | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Анталагічныя асновы фундаментальнай культуралогіі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Аксіялагічныя аспекты фундаментальнай культуралогіі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Інфармацыйна-тэксталагічнае разуменне культуры | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Архетыпы культуры | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Семіятычная прастора культуры як праблемнае поле фундаментальнай культуралогіі | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **54** | **30** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Культура як сістэма і з'ява грамадства і аб'ект вывучэння. Культура ў сістэме вытворчасці і сацыяльнай рэгуляцыі. Культура – скарбніца створаных чалавекам аб'ектаў. Артэфакт – антыпод прыроднаму. Культура як прадмет даследавання. Дыверсіфікацыя навук аб культуры. Месца культуралогіі сярод гуманітарных навук. Галіны культуралогіі: фундаментальная культуралогія, сацыяльная культуралогія, псіхалогія культуры, прыкладная культуралогія, культурная семіётыка.

### *Тэма 1. Пралегамены да культуралогіі*

Гістарычны аспект інтэрпрэтацыі культуры. Міфалагічнае разуменне культурнага вопыту чалавецтва ў старажытнасці. Імпліцытныя веды аб культуры ў гуманітарных ведах. Еўрапейскі вопыт філасофскага спасціжэння культуры. Этапы станаўлення паняцця «культура»: фіксацыя і апісанне самых розных асобных з'яў і працэсаў культуры. Вылучэнне культуры як самастойнага аб'екта пазнання. Выпрацоўка вызначэння паняцця «культура».

### *Тэма 2. Станаўленне культуралогіі*

Культура як фундаментальная з'ява ў жыцці чалавека, якая патрабуе для свайго вывучэння асобнай навукі. Ідэя навукі аб культуры В. Ф. Оствальда. Мадэль дзейнасці ў навуковай спадчыне А. Белага. Прадметныя і метадалагічныя асновы навуковых ведаў аб культуры Г. Рыкерта. Уяўленне месца і ролі навукі аб культуры ў агульнай сістэме навуковых ведаў Дж. Фейблмана. Тры самастойныя сферы культуры ў канцэпцыі Л. Уайта.

Праблемы культуры ў еўрапейскай антрапалогіі. Традыцыйная культура незаходніх народаў як аб'ект культурнай антрапалогіі. Кірункі і школы культурнай антрапалогіі. Культурна-гістарычная школа (Ф. Боас, А. Крёбер, Э. Сапір і інш.). Псіхалагічная антрапалогія (М. Мід, Р. Бенедыкт, Э. Х'юз і інш.). Сацыяльная антрапалогія (Б. Маліноўскі, А. Рэдкліф-Браўн, К. Леві-Строс і інш.). Тэалагічная культуралогія П. Тэяр дэ Шардэна. Асноўныя ідэі гуманістычнай культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культуралогія будучага (О. Тофлер, Ф. Фукуяма, С. Хантынгтан і інш.). Сацыялагічныя канцэпцыі культуры (Т. Адорна, Э. Фром, Г. Маркузе, Ю. Хабермас і інш.).

Постмадэрнізм і яго адценні ў нацыянальных культурах.

### *Тэма 3. Беларуская айчынная культуралагічная думка*

Перадумовы фарміравання імпліцытных ведаў аб культуры ў гуманітарных навуковых дысцыплінах. Канцэпцыі культурна-гістарычнага працэсу ў філасофіі Новага часу. Культура як прадмет свядомасці разумнага чалавека. Асэнсаванне адметнасцей карціны свету і ментальнасці беларусаў у літаратуры XIX ст. Праблема самасвядомасці культуры ў айчыннай філасофіі XIX ст.

Фарміраванне экспліцытных культуралагічных ведаў у Беларусі ў XX ст. Філасофская пранікнёнасць у сутнасць быцця беларусаў як суб’ектаў самабытнай культуры (І. Абдзіраловіч, М. Лоскі, М. Багдановіч і інш.).

Распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных праблем культуры ў айчыннай гуманітарыстыцы (Я. М. Бабосаў, А. С. Майхровіч, У. М. Конан, М. І. Крукоўскі і інш.).

Сучасная культуралагічная школа Рэспублікі Беларусь і асноўныя кірункі фундаментальных даследаванняў культуры.

### *Тэма 4. Культуралогія як навука*

Навуковы статус культуралогіі. Культуралогія як агульная тэорыя культуры, якая вывучае праблемы функцыянавання і развіцця культурных феноменаў. Культуралогія як сістэма ведаў аб культуры. Прадмет культуралогіі як навуковай дысцыпліны. Сэнсавы змест культуры, адлюстраваны ў сімвалічнай, вербальнай і матэрыяльнай формах. Культурныя сэнсы цывілізацыі, эпохі, грамадскай сістэмы, нацыі, этнічнасці, групы і інш. Мэты і задачы культуралогіі. Асноўныя функцыі навукі аб культуры. Праблемнае поле фундаментальнай культуралогіі. Асноўныя катэгорыі і міждысцыплінарныя сувязі навукі аб культуры. Універсаліі культуры. Значэнне культуралогіі ў сістэме гуманітарных ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Метады культуралогіі*

Культура як спецыфічны аб’ект і прадмет даследавання.

Паняцце метаду. Тыпы метадаў. Філасофскія метады: аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, фармалізацыя і актуалізацыя, эмпірычны і тэарэтычны, выдзяленне і абагульненне, назіранне і эксперымент, гістарычны і інш.

Агульнанавуковыя метады пазнання культуры: апісальны, параўнальны, параўнальна-гістарычны, структурны, тыпалагічны, сістэмны, рэканструктыўны, генетычны, мадэляванне і інш.

Спецыяльныя метады даследавання культуры: структурна-функцыянальны, кампаратыўны, сінхранічны, дыяхранічны, персаналагічны (біяграфічны), semiятычны, герменеўтычны, аксіялагічны, рэканструкцыі культурных палёў, сацыякультурны, гісторыка-генетычны, мазаічных рэканструкцый, сацыя-псіхалагічных і сацыякультурных інверсій і інш.

Прыватныя метады: кампанентны, марфалагічны, статыстычны, тэксталагічны і інш.

### *Тэма 6. Структура культуралогіі і яе месца ў сістэме навук*

Культуразнаўства як сума ведаў аб культуры, назапашаная шэрагам навук (археалогія, мастацтвазнаўства, філалогія, філасофія, сацыялогія, этналогія, этнаграфія і інш.). Культуралогія – ядро культуразнаўства.

Фундаментальная (тэарэтычная) культуралогія і яе асноўныя кірункі: распрацоўка катэгарыяльнага апарату культуры; выяўленне прычын генезісу культуры як феномена грамадскага жыцця; характарыстыка заканамернасцей развіцця культуры; метадалогія вывучэння культуры; характарыстыка базавых рыс і ўласцівасцей культуры; асэнсаванне спецыфікі феномена культуры; тыпалогія культуры; псіхалогія культуры; культурная семантыка; вывучэнне разнастайных сфер і элементаў сацыякультурнага арганізма; сацыякультурная прагностыка.

Гістарычная культуралогія як галіна навукі, якая вывучае працэс эвалюцыйнай самаарганізацыі быцця чалавецтва на розных этапах гісторыі. Культурагенез і ўзнаўленне дынамікі чалавечай жыццядзейнасці – праблемнае поле гістарычнай культуралогіі. Выяўленне спецыфікі эпахальных, нацыянальных і рэгіянальных тыпаў культуры як адзін з кірункаў гістарычнай культуралогіі. Вызначэнне асаблівасцей сучаснага тыпу культуры – задача гістарычнай культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкладная культуралогія і сферы яе выкарыстання: сацыялізацыя, хемінізацыя, інкультурацыя і акультурацыя асобы; сацыякультурнае прагназаванне, праектаванне і рэгуляванне; сацыякультурныя аспекты адукацыі; тэорыя культурнай палітыкі і дзейнасці культурных інстытутаў; ахова культурнай спадчыны; музейная справа; інфармацыйна-бібліятэчная справа; архіўная справа; краязнаўства; сацыякультурная рэабілітацыя і інш.

Галіновая культуралогія і яе віды: эвалюцыйная культуралогія, тэорыя традыцый, культуралогія мастацтва, культуралогія рэгіёна, культуралогія адукацыі, культуралогія паўсядзённасці, культурагенетыка і інш.

## *Тэма 7. Анталагічныя асновы фундаментальнай культуралогіі*

Анталогія культуры, ці «філасофія жыцця культуры». О. Шпенглер аб «жыцці-ў-культуры».

Сферы анталогіі культуры: а) анталогія знакава-сімвалічных кодаў мастацтва, выяўленне ўніверсальных прынцыпаў яго арганізацыі і функцыянаванне ў сучаснай культуры; б) анталогія рэлігійнага вопыту; в) анталагічны статус навуковых ведаў, навука як асобная частка культуры; г) самазахаванне культуры; д) нераўнамернасць развіцця розных падсістэм і элементаў культуры.

Уяўленне аб прыродзе ў сістэме культуралагічных ведаў. Успрыманне прыроды ў формах культуры. Праблемы адносін чалавека да прыроды. Фундаментальныя праблемы фарміравання і развіцця экалагічнай культуры.

Культуралагічныя веды аб чалавеку як аб «чалавеку культуры». Глабальны крызіс прасторы духоўнага вопыту. Чалавек у культуры XXI ст. «Антрапалагічны паварот» у фундаментальнай культуралогіі. Культура як працэс спасціжэння чалавекам яго сутнасці. Тэорыі асэнсавання чалавека ў кантэксце культурнага быцця: а) тэорыя дзейнасці; б) тэорыя індывідуальнасці; в) персаналісцкая тэорыя; г) дыялагічная канцэпцыя развіцця асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 8. Аксіялагічныя аспекты фундаментальнай культуралогіі*

Культурная каштоўнасць як аб’ектыўная значнасць, выражаная ў знаках і знакавых сістэмах дадзенай культуры. Каштоўнасць як «суб’ектна-аб’ектныя» адносіны (М. Каган, Г. Выжляцоў і інш.). Суаднесенасць паняццяў «культурныя каштоўнасці», «культурныя нормы», «ідэал».

Тыпалогія каштоўнасцей. Іерархія каштоўнасцей у культуры: механізмы яе выпрацоўкі, спосабы пабудовы, захавання і карэкціроўкі. Агульначалавечыя каштоўнасці. Функцыі каштоўнасцей і іх дынаміка.

Каштоўнасці народнай культуры як аксіялагічная аснова беларускай нацыянальнай культуры. Феномен антыкаштоўнасці. Носьбіты ідэалаў і каштоўнасцей у культурным працэсе. Феномен маргіналаў.

## *Тэма 9. Інфармацыйна-тэксталагічнае разуменне культуры*

Герменеўтыка як адна з форм асэнсавання чалавечага духоўнага вопыту, спосабу яго быцця. Гісторыя ўзнікнення і развіцця герменеўтычных канцэпцый. Рамантычная і гістарычная герменеўтыка. Універсальная філасофская герменеўтыка (Ф. Шлеермахер, Г.-Г. Гадамер, В. Дзільтэй, Э. Бэці, М. Хайдэгер і інш.).

Магчымасці герменеўтычнага метаду разумення тэкстаў культуры. Спецыфічныя падыходы да тэксту. Паняцце герменеўтычнага круга. Інтэрпрэтацыі ў герменеўтыцы і дэканструктывізме. Тэксталагічныя асаблівасці разнастайных тыпаў культуры.

## *Тэма 10. Архетыпы культуры*

Эўрыстычная роля ідэі архетыпа ў сучасным гуманітарным веданні. Паняцце «архетып культуры». Архетыпны вобраз (сімвал): нумінознасць, афектыўнасць, амбівалентнасць. Дамінантныя архетыпы (аніма, анімус, цень, персона, маці, самасць і інш.). Этнакультурныя архетыпы як адлюстраванне каштоўнасцей этнічнай культуры.

Архетыпныя вобразы і структуры ў міфах (Г. Слокховер, Д. Кэмпбел, К. Леві-Строс); казках (М.-Л. фон Франц, Х. Дзікман, У. Проп, А. Грэймас); літаратурным творы (Е. Мяляцінскі, Ю. Даманскі); выяўленчым мастацтве (А. Лосеў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

П. Фларэнскі, А. Роўнер); тэатральным мастацтве (Н. Фрай, П. Паві, Н. Піскун); кінамастацтве (Т. Гібсан, К. Карчэўская, Д. Яцына).

Працэс індывідуацыі. Адлюстраванне архетыпічнага пачатку ў менталітэце і духоўных арыентацыях народа.

### *Тэма 11. Семіятычная прастора культуры як праблемнае поле фундаментальнай культуралогіі*

Здольнасць чалавека да сімвалатворчасці як падмурак культуры. Семіётыка як навука і метад. Знак як культурны аб'ект у камунікацыйным працэсе. Знак і сімвал. Дэфініцыі знака. Уласцівасці сімвала. Знакавыя сістэмы і іх тыпы: вербальныя, графічныя, жэстамімічныя, іканічныя, вобразныя.

Паняцце і тыпы «кодаў». Культура як макракод, іерархія кодаў. Тыпы кодаў у культуры: сацыяльныя, тэкставыя, інтэрпрэтатыўныя.

Семіёзіс і яго структура (Ч. С. Пірс, Ч. Морыс, У. Эко). Семіясфера як знакавая прастора, прыкметы семіясферы: семіятычная нераўнамернасць, унутраная разнастайнасць, цэласнасць, абмежаванасць.

Тэкст як сэнсавае поле культуры. Разнастайнасць падыходаў да разумення тэксту (Р. Барт, А. Грэймс, Ж. Дэрыда). Функцыі тэксту: сэнсаўтварэння, сацыялізацыі і інкультурацыі, нарматыўнай каардынацыі супольнасці, аксіялагічная і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Библер, В. С.* Культура. Диалог культур / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 33–38.

3. *Гуревич, П. С.* Культурология / П. С. Гуревич. – М. : Знание, 1996. – 288 с.

4. *Игнатович, П. Г.* Этнические основания культуры / П. Г. Игнатович, Ю. В. Чернявская. – Минск : Технопринт, 2001. – 100 с.

5. *Иконникова, С. Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С. Н. Иконникова. – СПб. : С.-Петерб. гос. акад. культуры, 1996. – 264 с.

6. *Кармин, А. С.* Культурология / А. С. Кармин. – СПб. : Питер, 2001. – 464 с.

7. *Маркарян, Э. С.* Теория культуры и современная наука / Э. С. Маркарян. – М. : Мысль, 1983. – 284 с.

8. *Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры : учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Минск : АСАР, 2008. – 848 с.

9. *Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры : вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

10. *Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры : вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.

11. *Усовская, Э. А.* Постмодернизм в культуре ХХ в. / Э. А. Усовская. – Минск : БГУ, 2003. – 63 с.

12. *Флиер, А.* Культурология для культурологов / А. Флиер. – М. : Акад. проект, 2000. – 492 с.


*Дадатковая*


1. *Гуревич, А. Я.* Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А. Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1990. – 396 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Данилевский, Н. Г.* Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому / Н. Г. Данилевский. – М. : Книга, 1991. – 574 с.

3. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб. : Петрополис, 1997. – 205 с.

4. *Камю, А.* Бунтующий человек / А. Камю. – М. : Политиздат, 1990. – 415 с.

5. *Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М. : Мысль, 1982. – 623 с.

6. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

7. *Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет // Х. Ортега-и-Гассет. Избранные труды. – М. : Весь мир, 2000. – 704 с.

8. *Почепцов, Г. Г.* Теория коммуникаций / Г. Г. Почепцов. – М. : Релф-бук, 2001. – 656 с.

9. *Сорокин, П. А.* Человек. Цивилизация. Общество / П. А. Сорокин. – М. : Политиздат, 1992. – 544 с.

10. *Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура / Э. Б. Тайлор. – М. : Наука, 1989. – 612 с.

11. *Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М. : Прогресс, 1991. – 640 с.

12. *Тоффлер, Э.* Третья волна / Э. Тоффлер. – М. : АСТ, 2002. – 776 с.

13. *Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М. : РОССПЭН, 2004. – 960 с.

14. *Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М. : АСТ, 2004. – 220 с.

15. *Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Минск : Коллегиум, 1997. – 253 с.

16. *Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М. : АСТ, 2003. – 603 с.

17. *Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья / Й. Хёйзинга. – М. : Наука, 1988. – 544 с.

18. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М. : Канон, 1994. – 320 с.

19. *Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М. : Политиздат, 1991. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы, а таксама магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі да выпускніка, неабходнасцю павышэння якасці адукацыі і адначасова змяншэння часу, энерга- і працазатрат выкладчыка і студэнта на падрыхтоўку да традыцыйных лекцыйных, семінарскіх, практычных і іншых заняткаў, патрабаваннямі да ўваходжання ў сусветную адукацыйную прастору. Усё гэта ўплывае на вызначэнне статусу самастойнай работы студэнтаў як абавязковага базавага элемента прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

Для павышэння эфектыўнасці неабходна прытрымлівацца наступных рэкамендацый:

– вызначыць у пачатку семестра найбольш ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесіянальнай і асобаснай кампетэнтнасці спецыяліста;

– правільна арганізаваць самастойную работу;

– ажыццяўляць сістэматычны міжсесіённы кантроль за СРС і кіраўніцтва ёю;

– стварыць спрыяльныя ўмовы для яе здзяйснення;

– рэкамендаваць неабходную вучэбную, навуковую літаратуру, перыядычныя выданні культуралагічнага профілю;

– праводзіць пры неабходнасці кансультаванне і карэкцыю памылак студэнтаў, якія дапускаюцца ў працэсе самастойнага вывучэння вызначаных тэм;

– падвесці вынікі самастойнага засваення студэнтамі пытанняў вызначаных тэм, выкарыстоўваючы розныя формы кантролю (тэсты, калёквіумы, сціслыя пісьмовыя работы, прэзентацыі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,05. Ул.-выд. арк. 0,63. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.